ПАДЗЕЯ




# ЛІТАРАТУРНЫ ПАЛЕТАК

**Як жывеш, кніга? Як сёння араты наш літаратурны палетак? Адказы на гэтыя і іншыя пытанні можна было знайсці ў насычанай праграме V фестывалю кнігі «Гарадзенскі ЛітФэст» 30 мая бягучага года.**



Сапраўднае свята кнігі традыцыйна ладзіцца ў гістарычным цэнтры Гродна намаганнямі калектываў Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я.Карскага і Гродзенскай Цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы. Удзел Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі ў праграме фестывалю таксама з'яўляецца часткай традыцыі. Абавязковая асаблівасць кожнага паўнавартаснага свята – яго госці. І на гэты раз у складзе шматлікіх удзельнікаў форуму яны былі. Наш фотарэпартаж дапаможа з імі пазнаёміцца.

Не выпадкова на ўсходзе госця лічаць прадстаўніком Бога. Нягледзячы на тое, што мы жывем не на ўсходзе, сакральны статус нашых гасцей аспрэчваць не будзем. І раскажам у нашым фотарэпартажы больш падрабязна пра тых гасцей Гродзеншчыны літаратурнай, якія завіталі да нас на V фестываль кнігі «Гарадзенскі ЛітФэст». Не забудзем расказаць і пра фестывальныя выступленні гарадзенцаў.




**Фестывальную праграму аб'яўляе адкрытай галоўны спецыяліст галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама Ірына Юр'еўна Жук-Куніцкая**




**З вершаваным прывітальным словам да ўдзельнікаў V «Гарадзенскага ЛітФэсту» звярнулася старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ, вядомая беларуская паэтэса Людміла Антонаўна Кебіч**

Аўтарскія літаратурныя выступленні ў рамках фестывалю складаліся з трох блокаў, а ў іх фінале гродзенскіх аматараў мастацкага слова чакалі прыемныя сюрпрызы – сустрэчы з цікавымі творцамі, нашымі гасцямі.




***

…Не шкадуючы сіл, аддаючы ўсяго сябе ідэям грамадскага служэння, верны ім застаецца ганаровы член СПБ, ветэран узброеных сіл, ветэран літаратурнага руху на Беларусі, паэт з Гродна Браніслаў Ермашкевіч. Як патрыярху Браніславу Іосіфавічу (*на фота*) прадстаўляецца ганаровая роля першага па ліку выступоўцы. Адна з галоўных тэм творчасці паэта – Вялікая Айчынная вайна, памяць пра загінуўшых воінаў-вызваліцеляў Беларусі і горада Гродна, а таксама горкія ўрокі гэтай жудаснай трагедыі агульнапланетарнага маштабу, якія нельга забываць. Нельга забываць ніколі і нікому.

***

Чарговы прадстаўнік СПБ, пісьменнік з Гродна Анатоль Апанасевіч (*на фота*) зусім нядаўна прэзентаваў сваю новую кнігу – зборнік філасофскіх афарызмаў «Чырвоныя фразы». Творчыя памкненні Анатоля Уладзіміравіча вельмі разнастайныя. Цвёрдай прынцыповасцю адрозніваецца грамадзянская пазіцыя творцы. У праграме «Гарадзенскага ЛітФэсту» ў аўтарскім выкананні прагучаў яго зусім новы верш пад назвай «Есть у настоящего герои» на грамадска-палітычную тэматыку.






***

Тэме ваеннага ліхалецця, дзяцінства, абпаленага вайной, было прысвечана выступленне ветэрана працы, грамадскага дзеяча Наталлі Чаклінай-Гарбачовай (*на фота*). Вядомы і паважаны ў горадзе творчы чалавек, дзіця вайны, паэтэса, празаік прадстаўляе гарадское літаратурнае аб'яднанне «Надзея», ля вытокаў стварэння якога ў свой час і стаяла Наталля Васільеўна.

***

Цікавы і вельмі кранальны эпізод. Выступленне Н.В.Чаклінай-Гарбачовай зрабіла вельмі моцнае ўражанне на зусім незнаёмага чалавека. Сваімі пачуццямі мужчына вырашыў шчыра падзяліцца з паэтэсай.



***

Працягвае аўтарскі літаратурны блок пад нумарам адзін кіраўнік Гродзенскага гарадскога літаратурнага аб'яднання «Надзея», паэтэса Святлана Глембоцкая (*на здымку*). Творы Святланы Валянцінаўны адрознівае арыгінальнасць пабудовы тэксту, філасофская глыбіня. Нечаканы, але прыемны факт – частка выступлення паэтэсы была прысвечана асобе нашага агульнага сябра, украінскага паэта з Гродна Р.С.Гармаша.






***

Ля мікрафона член СПБ, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі, лаўрэат Прэміі імя А.І.Дубко за дасягненні ў галіне культуры і мастацтва, лаўрэат Прэміі імя Цёткі (А.С.Пашкевіч), гродзенская дзіцячая пісьменніца Ганна Скаржынская-Савіцкая (*на фота*). Кожная кніга аўтара (а іх у Ганны Іосіфаўны ў апошні час выходзіць шмат) – сапраўдны падарунак маленькім прыхільнікам мастацтва слова, іх педагогам і бацькам. Свой прыўзняты настрой з дапамогай двух вершаў на роднай мове пісьменніца накіравала ўсім наведвальнікам фестывалю.



***

Што можа быць на свяце лепш, чым добрая песня! Завяршыўся першы блок аўтарскіх выступленняў падарункам ад нашай госці з горада Ліда. З песняй уласнага сачынення на фестывалі «Гарадзенскі ЛітФэст» выступіла беларуская паэтэса, аўтар і выканаўца песень Людміла Краснадубская (*на фота*). Меладычную песню на роднай мове публіка прыняла «на ўра».










**Тым часам у спецыяльна абсталяванай аўтограф-зоне можна было непасрэдна пазнаёміцца з некаторымі сучаснымі літаратарамі з Гродна і не толькі, а таксама набыць іх кнігі з аўтографам.**




**Першы блок аўтарскіх выступленняў у праграме «Гарадзенскага ЛітФэсту» скончаны. Як кажуць, добры пачатак – палова справы... На фота: 30 мая 2021 года, фестываль кнігі «Гарадзенскі ЛітФэст», арганізатары, удзельнікі, госці.**












**«Гарадзенскі ЛітФэст-2021». На фестывальнай пляцоўцы пануе свая непаўторная атмасфера**








**У аўтограф-зоне фестывалю ідуць аўтограф-сесіі сучасных беларускіх пісьменнікаў**










**У другім блоку аўтарскіх выступленняў прынялі ўдзел гродзенскія паэты Дзмітрый Радзівончык, Кацярына Ігнацюк, Антаніна Нурэтдзінава, Алена Марынец. Прагучалі напісаныя ў розныя гады паэтычныя творы на беларускай і рускай мовах маральна-філасофскай і патрыятычнай тэматыкі.**




**Выступаюць госці «Гарадзенскага ЛітФэсту», паэтэсы Таццяна Яцук (Баранавічы) і Зоя Капуста-Кулік (Нясвіж)**

Таццяна Мікалаеўна Яцук з’яўляецца членам Міжнароднай асацыяцыі пісьменнікаў і публіцыстаў (МАПП). Нарадзілася на Навагрудчыне. Скончыла філалагічны факультэт БДУ. Працуе настаўнікам беларускай мовы і літаратуры. Творы Таццяны Яцук можна ўбачыць на старонках калектыўных зборнікаў і перыядычных выданняў Беларусі. Аўтар зборнікаў вершаў: «Груша над абрывам» (2017); «Маладосць на выданні» (2017); «Валошкавыя сны» (2018); «Паэма блукання і веры» (2019); «Бліскавіцы над Свіцяззю» (2019); «Алфавітная музыка слоў» (2020). Кіраўнік літаратурнага аб’яднання «Купальскія зоры» пры Баранавіцкай цэнтральнай бібліятэцы. Жыве ў Баранавічах з 1988 года. Піша на беларускай мове.

Зоя Мікалаеўна Капуста-Кулік – афіцыйны прадстаўнік Міжнароднай асацыяцыі пісьменнікаў і публіцыстаў (МАПП) у Беларусі. Скончыла Мінскі педагагічны інстытут па спецыяльнасці «выкладчык педагогікі і псіхалогіі». Піша вершы, сцэнарыі, апавяданні, публіцыстыку. Аўтар кніг паэзіі і прозы «Перад табой стаю», «Капыльская містэрыя» і выдадзенай асобнай кнігай паэмы «Ад Нясвіжа да Грунвальда». Зоя Мікалаеўна Капуста-Кулік аўтар і вядучая літаратурна-публіцыстычнай праграмы «Вас вітае Беларусь» на міжнародным радыё «Акіян плюс», у эфіры якога рэгулярна адбываюцца цікавыя сустрэчы і гутаркі з беларускімі літаратарамі. Жыве ў Нясвіжы. Піша на беларускай мове.






Кінамеладэкламатар Юрый Рэдзькоў (Мінск)

***

Яшчэ адзін госць «Гарадзенскага ЛітФэсту» прыехаў з Мінска – Юрый Аляксеевіч Рэдзькоў (Юрий Редьков). Творчае амплуа Юрыя – кінамеладэкламатар. Вось якую інфармацыю пра яго можна знайсці ў адкрытым доступе: Юрый Аляксеевіч нарадзіўся 12 красавіка 1976 года і быў названы ў гонар Юрыя Гагарына, заўсёды марыў стаць касманаўтам, але касмадром апынуўся ў іншай краіне, таму прыйшлося шукаць свой сэнс у гэтым жыцці. Дзяцінства правёў у дзіцячым доме, прайшоў праз шэсць школ-інтэрнатаў. Юрый Рэдзькоў займаецца дэкламацыяй твораў мастацкай літаратуры з выкарыстаннем музыкі і кінафрагментаў. Выступленне Юрыя ў праграме V Гродзенскага фестывалю кнігі (аддзел мастацтва Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я.Ф.Карскага) пакінула вельмі яркія ўражанні і выклікала вострыя культуралагічныя дыскусіі.



Спадзяемся, што наш фотарэпартаж не толькі стаў інфармацыйнай крыніцай, але і, выклікаўшы цікавасць, у многіх людзей абудзіў жаданне наведаць, а магчыма, і стаць удзельнікам наступнага літаратурнага форуму ад галоўнай бібліятэкі Прынёмання. Падзея стала гісторыяй. Можна падводзіць вынікі, аналізаваць, рабіць высновы. Хацелася б пажадаць арганізатарам яшчэ больш увагі да дыялогу пакаленняў – дзейснага сродку ў справе духоўнага ацалення, узбагачэння грамадства – да творчасці класікаў-юбіляраў Гродзеншчыны літаратурнай і тых, хто сёння працягвае іх справу. Цікавасць да мастацтва слова і айчыннай літаратуры ў горадзе над Нёманам пакуль яшчэ назіраецца. Але ёсць і падставы для непакою. Варта прыслухацца да голасу класіка.

Ці то глеба да нічога?
Ці то рукі ў нас слабыя,
Што не маем зерня свога,
Што мы ходзім, як сляпыя?

Цётка «Наш палетак»

***ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА***